КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А.В. Макоўчык
«__» ______ 2021 г.
Рэгістрацыйны № УД-26-1/уч.
№ 9/2021

# ЭВАЛЮЦЫЯ САСЛОЎЯЎ БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

2021 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі І ступені (пакаленне 3+) спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.04. 2022 г., рэгістрацыйны № 85 і вучэбнага плана спецыяльнасці: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, зацверджанага 15.07.2021 рэгістрацыйны № 016-2021/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**

А.П.Жытко, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, доктар гістарычных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Т.В.Даўгач, кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі

П.А.Мацюш, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 40 г.Мінска» І.А.Бабкоў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 13 ад 30. 04. 2021).
Загадчык кафедры С.А.Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 7 ад 16 . 06 .2021).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства, з пераходам яго да рыначных эканамічных адносін, якія парываюць з уяўнай сацыялістычнай маёмаснай справядлівасцю і фарміруюць сацыяльную градацыю насельніцтва і адпаведную ментальнасць, зварот гісторыкаў да працэсаў станаўлення і развіцця саслоўяў і класаў мае не толькі навукова-тэарэтычнае, але і практычнае значэнне.

У савецкай гістарычнай навуцы, аснову метадалогіі якой складаў прынцып партыйна-класавага падыходу, а рухавіком грамадскага прагрэсу выступала класавая барацьба, пануючым саслоўям і класам адводзілася адмоўная, а прыгнечаным – станоўчая роля ў жыцці грамадства.

Засваенне матэрыялу вучэбнай дысцыпліны дасць магчымасць раскрыць уклад кожнай саслоўнай групы ў палітычнае, эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі з VI па XX ст. З прыняццем у 1906 г.”Асноўных законаў Расійскай імперыі” (Канстытуцыі) саслоўная стратыфікацыя юрыдычна была скасавана, што прыблізіла краіну да фарміравання грамадзянскай супольнасці.

Праблемна-храналагічны падыход дазволіць паглыбіць эмпірычныя і навукова-тэарэтычныя веды студэнтаў па палітычнай і сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі ў шырокім часавым і прасторавым вымярэнні.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны – выяўленне ролі і месца розных саслоўных груп у сацыяльна-эканамічным развіцці і палітычным жыцці Беларусі з VI па XX ст.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы:**

- раскрыць працэс станаўлення і трансфармацыю вышэйшага саслоўя Беларусі;

паказаць эвалюцыю саслоўя сельскіх абывацелей з VI да пачатку XX ст.;

- выявіць сацыяльную стратыфікацыю гарадскога насельніцтва края;
- прааналізаваць уклад розных саслоўных груп у эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі.

Вучэбная дысцыпліна непасрэдным чынам звязана з авалодваннем зместу такіх навуковых дысцыплін, як гісторыя Беларусі, эканоміка, паліталогія, псіхалогія і інш. Таму паспяховая прафесійная падрыхтоўка выкладчыка гісторыі немагчымая без ажыццяўлення міждысцыплінарнага падыходу ў працэсе навучання на гістарычным факультэце педагагічнага ўніверсітэта.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

- прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага працэсу;
- агульнае і адметнае ў гісторыі саслоўяў Беларусі ў параўнанні з памежнымі краінамі;
- асноўныя этапы трансфармацыі саслоўяў Беларусі;

- ролю і месца саслоўяў у сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці края.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

- свабодна аперыраваць фактамі гістарычнай рэчаіснасці, гістарычных крыніц і навукова-гістарычнымі фактамі;
- паспяхова выкарыстоўваць атрыманыя веды ў працэсе выкладання гісторыі ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

- метадамі гістарычнага пазнання;
- навуковым катэгарыяльным і панятыйным апаратам па вучэбнай дысцыпліне.

У працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнт установы вышэйшай адукацыі павінен развіць наступныя спецыялізаваныя кампетэнцыі (СК):

СК-9. Прымяняць веды аб сацыяльнай трансфармацыі ад саслоўнай арганізацыі да фарміравання грамадзянскай супольнасці.

У працэсе вывучэння кожнай тэмы студэнт павінен навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (мадэліравання, ідэалізацыі, індукцыі і дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.) гістарычнага пазнання.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Эвалюцыя саслоўяў Беларусі» па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» вучэбным планам адведзена ўсяго 98 гадзін (3 зал. адз.), з іх: аўдыторных – 52 гадзіны : 22 гадзіны – лекцый, 30 гадзін – семінарскіх заняткаў (4 гадзіны – кіруемая самастойная работа студэнта), на самастойную работу – 46 гадзін, залік у 2 семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» вучэбным планам адведзена ўсяго 98 гадзін (3 зал. адз.), з іх: аўдыторных – 14 гадзін (8 гадзін– лекцыйных, 6 гадзін – семінарскіх заняткаў), залік у 2 семестры.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну «Эвалюцыя саслоўяў Беларусі».**

Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Гістарыяграфія праблемы. Крыніцы па вывучэнні дысцыпліны.

**Тэма 2. Сельскае насельніцтва ў VI – першай палове XIII ст.**

Разлажэнне родаплемянных адносін. Пераход да ворыўнага земляробства. Распад родавай і стварэнне сельскай абшчыны (верві). Вялікасямейная (VI–VII стст.), суседска-вялікасямейная (VIII–IX стст.), суседская (X–XI стст.) абшчыны. Пераход ад родавай да сямейнай і індывідуальнай уласнасці. Сацыяльныя групы сялянства і іх трансфармацыя: людзі, смерды, закупы, радовічы, прошчаннікі, ізгоі, халопы.

**Тэма 3. Фарміраванне вышэйшага саслоўя.**

Велікакняжацкая ўлада. Старэйшыя і малодшыя дружыннікі. Васалітэт. Васал-дружыннік, мужы, баяры. Складванне спадчыннай уласнасці – вотчыны. Княжацкія і баярскія вотчыны. Фарміраванне саслоўя феадалаў.

**Тэма 4. Вышэйшае саслоўе ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.**

Вялікі князь і яго ўлада. Князі – нашчадкі Рурыкавічаў і Гедымінавічаў. Вышэйшая чыноўная знаць – паны. Свецкія феадалы – шляхта і зямяне. Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць вышэйшага саслоўя. Маёмасная іерархія свецкіх феадалаў. Шляхецкае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай.

**Тэма 5. Сацыяльная трансфармацыя сельскага насельніцтва.**

Сялянскае спадчыннае землекарыстанне – вотчына. Натуральны характар сельскай гаспадаркі. Сяляне-даннікі і сяляне-дольнікі. Пераўтварэнне даннікаў у цяглых людзей. Паншчына. Перавод на грашовую рэнту асадных людзей і чыншавікоў. Адработная рэнта. Аграрная рэформа 1557 г. Валочная памера. Рэгламентаванне грашовай рэнты і паншчыны.

Запрыгоньванне сялянства. Асабіста вольныя сяляне. Асабіста залежныя сяляне: «людзі пахожыя», альбо «вольныя»; «людзі непахожыя», альбо «вотчычы»; «чэлядзь нявольная» (рабы); «закупы». Юрыдычнае афармленне прыгоннага права ў ВКЛ – Прывілей 1447 г. Замацаванне прыгону ў Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.

**Тэма 6. Саслоўны склад гарадскога насельніцтва ў IX–XVIII стст.**

Абасабленне рамяства ад земляробства і ўзнікненне гарадскіх паселішчаў. Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі – Полацк, Тураў, Віцебск, Заслаўе, Друцк, Бярэсце і інш. Гарады як гандлёва-рамесныя, адміністрацыйна-фіскальныя, ваенна-абарончыя, культурныя і рэлігійныя цэнтры. Насельніцтва гарадоў. Свецкія і духоўныя феадалы, прыслуга,

рамеснікі, купцы. Купецкія і рамесныя цэхі. Магдэбургскае права. Гарадское самакіраванне і асаблівасці яго рэалізацыі ў гарадах Беларусі.

**Тэма 7. Вышэйшае саслоўе Беларусі ў 1772–1861 гг.**

Распаўсюджанне прывілеяў расійскага дваранства на шляхту былой Рэчы Паспалітай. Спадчыннае і асабовае дваранства. Даравальная грамата дваранству1785 г. Структура і функцыі ораганаў дваранскага самакіравання. Паместнае дваранства. Насаджэнне рускага землеўладання. Зямельныя канфіскацыі. Палітыка «разбору шляхты». Памешчыцкая сельскагаспадарчая і прамысловая вытворчасць. Інвентарная рэформа.

**Тэма 8. Саслоўе сельскіх абывацелей у 1772–1861 гг.**

Сацыяльныя групы саслоўя сельскіх абывацелей. Дзяржаўныя, удзельныя і памешчыцкія сяляне. Вольныя людзі, аднадворцы, праваслаўныя арандатары, каланісты, адзінаверцы, чыншавікі і інш.

Сялянская гаспадарка. Павіннасці панскіх сялян па выніках інвентарнай рэформы. Дзяржаўныя падаткі і павіннасці сялянства. Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўных маёнтках. Органы самакіравання дзяржаўных сялян.

**Тэма 9. Саслоўе гарадскіх абывацелей у 1772–1875 гг.**

Дынаміка колькасці гарадскога насельніцтва. Адміністрацыйныя і грамадскія функцыі гарадоў. «Жалованная грамота на права и выгоды городам Российской империи» 1785 г. Увядзенне саслоўнага гарадскога самакіравання. Асноўныя сацыяльныя групы насельніцтва гарадоў. Падаткі і павіннасці гараджан. Эканоміка беларускіх гарадоў.

Трансфармацыя саслоўнага гарадскога самакіравання ў бессаслоўнае ў 1875 г. Фактычная ліквідацыя саслоўя гарадскіх абывацелей.

**Тэма 10. Вышэйшае саслоўе Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.**

Дынаміка колькаснага, канфесійнага і нацыянальнага складу дваранства края. Тэрытарыяльная мабільнасць і ўзровень адукацыі саслоўя. Ліквідацыя выбарных органаў дваранскай карпарацыі. Трансфармацыя інстытута прадвадзіцелей дваранства. Праблема аднаўлення дваранскіх выбараў. Дзяржаўная служба вышэйшага саслоўя.

Гаспадарча-эканамічная дзейнасць паместнага дваранства. Дваранскае змелеўладанне і земляробства. Пераход ад баршчыннай да капіталістычнай сістэмы ў земляробстве. Дваранская жывёлагадоўля. Прамысловае прадпрымальніцтва. Сацыяльная дыферэнцыяцыя вышэйшага саслоўя і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства.

**Тэма 11. Саслоўе сельскіх абывацелей у 1861–1917 гг.**

Аграрная рэформа 1861 г. Ліквідацыя прыгону. Асабістая незалежнасць сялян. Надзяленне зямлёй. Выкупная аперацыя. Рэформа ўдзельнай і дзяржаўнай вёскі. Органы сялянскага саслоўнага самакіравання. Сталыпінская аграрная рэформа. Ліквідацыя абшчыннага і ўсталяванне асабістага прыватнага землеўладання сялян. Стварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак. Перасяленне сялян. Аказанне агратэхнічнай дапамогі.

Сялянская сельскагаспадарчая вытворчасць. Земляробства. Пераход ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы ў земляробстве. Жывёлагадоўля. Сялянскія промыслы і прадпрымальніцтва. Эканамічная і сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства.

Трансфармацыя функцый органаў сялянскага самакіравання ў эпоху сталыпінскіх рэформ. Пераўтварэнне селяніна з паў-персоны ў грамадзяніна.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«Эвалюцыя саслоўяў Беларусі»**
па спецыяльнасці 1-02 01 01 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздела, тэмы, занятку | Назва раздзела, тэмы, занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная работа (пазааўдыторная) | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | | |
| **2 семестр** | | | | | | | | |
| **1** | **Тэма. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну «Эвалюцыя саслоўяў Беларусі».**<br>1. Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.<br>2. Гістарыяграфія праблемы.<br>3. Крыніцы па вывучэнні дысцыпліны. | **2** | | | | Мультымедыйнае суправаджэнне | [1,3,4] | Канспект лекцый |
| **2** | **Тэма. Сельскае насельніцтва ў VI – першай палове XIII ст.**<br>1. Разлажэнне родаплемянных адносін.<br>2. Пераход да ворыўнага земляробства.<br>3. Распад родавай і стварэнне сельскай абшчыны (верві). Вялікасямейная (VI–VII стст.), суседска-вялікасямейная (VIII–IX стст.), суседская (X–XI стст.) абшчыны.<br>4. Пераход ад родавай да сямейнай і індывідуальнай уласнасці.<br>5. Сацыяльныя групы сялянства і іх трансфармацыя: | **2** | | | **4** | | [1,3,4] | Канспект лекцый |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | людзі, смерды, закупы, радовічы, прошчаннікі, ізгоі, халопы. | | | | | | | |
| 3 | **Тэма. Фарміраванне вышэйшага саслоўя.**<br>1. Велікакняжацкая ўлада.<br>2. Старэйшыя і малодшыя дружыннікі. Васалітэт. Васал-дружыннік, мужы, баяры.<br>3. Складванне спадчыннай уласнасці – вотчыны. Княжацкія і баярскія вотчыны.<br>4. Фарміраванне саслоўя феадалаў. | | **2** | | **4** | Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Канспект лекцый |
| 4 | **Тэма. Вышэйшае саслоўе ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.**<br>1. Вялікі князь і яго ўлада. Князі – нашчадкі Рурыкавічаў і Гедымінавічаў.<br>2. Вышэйшая чыноўная знаць – паны.<br>3. Свецкія феадалы – шляхта і зямяне.<br>4. Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць вышэйшага саслоўя.<br>5. Маёмасная іерархія свецкіх феадалаў.<br>6. Шляхецкае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай. | **2** | **2** | | **4** | Электронная карта «Вялікае Княства Літоўскае»<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Канспект лекцый |
| 5 | **Тэма. Сацыяльная трансфармацыя сельскага насельніцтва.**<br>1. Сялянскае спадчыннае землекарыстанне – вотчына. Натуральны характар сельскай гаспадаркі.<br>2. Сяляне-даннікі і сяляне-дольнікі. Пераўтварэнне даннікаў у цяглых людзей.<br>3. Паншчына. Перавод на грашовую рэнту асадных людзей і чыншавікоў. Адработная рэнта.<br>4.Аграрная рэформа 1557 г. Валочная памера. Рэгламентаванне грашовай рэнты і паншчыны.<br>5. Запрыгоньванне сялянства. Асабіста вольныя сяляне. Асабіста залежныя сяляне: «людзі пахожыя», альбо «вольныя»; «людзі непахожыя», альбо «вотчычы»; «чэлядзь нявольная» (рабы); «закупы».<br>6. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права ў ВКЛ – | **2** | **2** | | **4** | Электронная карта «Вялікае Княства Літоўскае»<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Канспект лекцый |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Прывілей 1447 г.<br>7. Замацаванне прыгону ў Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. | | | | | | | |
| **6** | **Тэма. Саслоўны склад гарадскога насельніцтва ў IX–XVIII стст.**<br>1. Абасабленне рамяства ад земляробства і ўзнікненне гарадскіх паселішчаў.<br>2. Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі – Полацк, Тураў, Віцебск, Заслаўе, Друцк, Бярэсце і інш.<br>3. Гарады як гандлёва-рамесныя, адміністрацыйна-фіскальныя, ваенна-абарончыя, культурныя і рэлігійныя цэнтры.<br>4. Насельніцтва гарадоў. Свецкія і духоўныя феадалы, прыслуга, рамеснікі, купцы.<br>5. Купецкія і рамесныя цэхі.<br>6. Магдэбургскае права. Гарадское самакіраванне і асаблівасці яго рэалізацыі ў гарадах Беларусі. | **2** | **2** | | **4** | Электронная карта «Вялікае Княства Літоўскае»<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Канспект лекцый |
| **7** | **Тэма. Вышэйшае саслоўе Беларусі ў 1772–1861 гг.**<br>1. Распаўсюджанне прывілеяў расійскага дваранства на шляхту былой Рэчы Паспалітай.<br>2. Спадчыннае і асабовае дваранства.<br>3. Даравальная грамата дваранству1785 г.<br>4. Структура і функцыі ораганаў дваранскага самакіравання.<br>5. Паместнае дваранства. Насаджэнне рускага землеўладання. Зямельныя канфіскацыі.<br>6. Палітыка «разбору шляхты».<br>7. Памешчыцкая сельскагаспадарчая і прамысловая вытворчасць.<br>8. Інвентарная рэформа. | **2** | **2** | **2с** | **4** | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,2,3,4, 5,6,7] | Даклады |
| **8** | **Тэма. Саслоўе сельскіх абывацелей у 1772–1861 гг.**<br>1. Сацыяльныя групы саслоўя сельскіх абывацелей. Дзяржаўныя, удзельныя і памешчыцкія сяляне. | | **2** | **2с** | **4** | Карта “Беларусь у складзе Расійскай | [1,2,3,4, 5,6,7] | Паведамленні |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Вольныя людзі, аднадворцы, праваслаўныя арандатары, каланісты, адзінаверцы, чыншавікі і інш.<br>3. Сялянская гаспадарка.<br>4. Павіннасці панскіх сялян па выніках інвентарнай рэформы.<br>5. Дзяржаўныя падаткі і павіннасці сялянства.<br>6. Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўных маёнтках.<br>7. Органы самакіравання дзяржаўных сялян. | | | | | імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | | |
| **9** | **Тэма. Саслоўе гарадскіх абывацелей у 1772–1875 гг.**<br>1. Дынаміка колькасці гарадскога насельніцтва. Адміністрацыйныя і грамадскія функцыі гарадоў.<br>2. «Жалованная грамота на права и выгоды городам Российской империи» 1785 г. Увядзенне саслоўнага гарадскога самакіравання.<br>3. Асноўныя сацыяльныя групы насельніцтва гарадоў.<br>4. Падаткі і павіннасці гараджан. Эканоміка беларускіх гарадоў.<br>5. Трансфармацыя саслоўнага гарадскога самакіравання ў бессаслоўнае ў 1875 г. Фактычная ліквідацыя саслоўя гарадскіх абывацелей. | | **2** | | **4** | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,2,3,4, 5,6,7] | Даклад |
| **10** | **Тэма. Вышэйшае саслоўе Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.**<br>1. Дынаміка колькаснага, канфесійнага і нацыянальнага складу дваранства края.<br>2. Тэрытарыяльная мабільнасць і ўзровень адукацыі саслоўя.<br>3. Ліквідацыя выбарных органаў дваранскай карпарацыі.<br>4. Трансфармацыя інстытута прадвадзіцелей дваранства.<br>5. Праблема аднаўлення дваранскіх выбараў.<br>6. Дзяржаўная служба вышэйшага саслоўя.<br>7. Гаспадарча-эканамічная дзейнасць паместнага дваранства.<br>8. Дваранскае землеўладанне і земляробства. Пераход | **6** | **6** | | **6** | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,2,3,4, 5,6,7] | Канспект лекцый |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ад баршчыннай да капіталістычнай сістэмы ў земляробстве.<br>9. Дваранская жывёлагадоўля.<br>10. Прамысловае прадпрымальніцтва.<br>11. Сацыяльная дыферэнцыяцыя вышэйшага саслоўя і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства. | | | | | | | |
| **11** | **Тэма. Саслоўе сельскіх абывацелей у 1861–1917 гг.**<br>1. Аграрная рэформа 1861 г. Ліквідацыя прыгону. Асабістая незалежнасць сялян.<br>2. Надзяленне зямлёй. Выкупная аперацыя.<br>3. Рэформа ўдзельнай і дзяржаўнай вёскі.<br>4. Органы сялянскага саслоўнага самакіравання.<br>5. Сталыпінская аграрная рэформа.<br>6. Ліквідацыя абшчыннага і ўсталяванне асабістага прыватнага землеўладання сялян.<br>7. Стварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак.<br>8. Перасяленне сялян. Аказанне агратэхнічнай дапамогі.<br>9. Сялянская сельскагаспадарчая вытворчасць. Земляробства. Пераход ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы ў земляробстве.<br>10. Жывёлагадоўля.<br>11. Сялянскія промыслы і прадпрымальніцтва.<br>12.Эканамічная і сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства.<br>13. Трансфармацыя функцый органаў сялянскага самакіравання ў эпоху сталыпінскіх рэформ.<br>14. Пераўтварэнне селяніна з паў-персоны ў грамадзяніна | **4** | **6** | | **8** | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,2,3,4, 5,6,7] | Канспект лекцый |
| **Усяго** | | **22** | **26** | **4** | **46** | | | **залік** |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Эвалюцыя саслоўяў Беларусі»
па спецыяльнасці 1-02 01 01 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
(завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздела, тэмы, занятку | Назва раздзела, тэмы, занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | |
| **2 семестр** | | | | | | |
| 1 | **Тэма. Фарміраванне вышэйшага саслоўя.**<br>1. Вялікакняжацкая ўлада.<br>2. Старэйшыя і малодшыя дружыннікі. Васалітэт. Васал-дружыннік, мужы, баяры.<br>3. Складванне спадчыннай уласнасці – вотчыны. Княжацкія і баярскія вотчыны.<br>4. Фарміраванне саслоўя феадалаў. | | 2 | Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Паведамленне |
| 2 | **Тэма. Вышэйшае саслоўе ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.**<br>1. Вялікі князь і яго ўлада. Князі – нашчадкі Рурыкавічаў і Гедымінавічаў.<br>2. Вышэйшая чыноўная знаць – паны.<br>3. Свецкія феадалы – шляхта і зямяне.<br>4. Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць вышэйшага саслоўя.<br>5. Маёмасная іерархія свецкіх феадалаў.<br>6. Шляхецкае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай. | 2 | | Электронная карта «Вялікае Княства Літоўскае»<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Канспект лекцый |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3** | **Тэма. Сацыяльная трансфармацыя сельскага насельніцтва.**<br>1. Сялянскае спадчыннае землекарыстанне – вотчына. Натуральны характар сельскай гаспадаркі.<br>2. Сяляне-даннікі і сяляне-дольнікі. Пераўтварэнне даннікаў у цяглых людзей.<br>3. Паншчына. Перавод на грашовую рэнту асадных людзей і чыншавікоў. Адработная рэнта.<br>4. Аграрная рэформа 1557 г. Валочная памера. Рэгламентаванне грашовай рэнты і паншчыны.<br>5. Запрыгоньванне сялянства. Асабіста вольныя сяляне. Асабіста залежныя сяляне: «людзі пахожыя», альбо «вольныя»; «людзі непахожыя», альбо «вотчычы»; «чэлядзь нявольная» (рабы); «закупы».<br>6. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права ў ВКЛ – Прывілей 1447 г.<br>7. Замацаванне прыгону ў Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. | **2** | | Электронная карта «Вялікае Княства Літоўскае»<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Канспект лекцый |
| **4** | **Тэма. Саслоўны склад гарадскога насельніцтва ў IX–XVIII стст.**<br>1. Абасабленне рамяства ад земляробства і ўзнікненне гарадскіх паселішчаў.<br>2. Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі – Полацк, Тураў, Віцебск, Заслаўе, Друцк, Бярэсце і інш.<br>3. Гарады як гандлёва-рамесныя, адміністрацыйна-фіскальныя, ваенна-абарончыя, культурныя і рэлігійныя цэнтры.<br>4. Насельніцтва гарадоў. Свецкія і духоўныя феадалы, прыслуга, рамеснікі, купцы.<br>5. Купецкія і рамесныя цэхі.<br>6. Магдэбургскае права. Гарадское самакіраванне і асаблівасці яго рэалізацыі ў гарадах Беларусі. | | **2** | Электронная карта «Вялікае Княства Літоўскае»<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,3,4] | Паведамленне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | **Тэма. Вышэйшае саслоўе Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.**<br>1. Дынаміка колькаснага, канфесійнага і нацыянальнага складу дваранства края.<br>2. Тэрытарыяльная мабільнасць і ўзровень адукацыі саслоўя.<br>3. Ліквідацыя выбарных органаў дваранскай карпарацыі.<br>4. Трансфармацыя інстытута прадвадзіцелей дваранства.<br>5. Праблема аднаўлення дваранскіх выбараў.<br>6. Дзяржаўная служба вышэйшага саслоўя.<br>7. Гаспадарча-эканамічная дзейнасць памеснага дваранства.<br>8. Дваранскае змелеўладанне і земляробства. Пераход ад баршчыннай да капіталістычнай сістэмы ў земляробстве.<br>9. Дваранская жывёлагадоўля.<br>10. Прамысловае прадпрымальніцтва.<br>11. Сацыяльная дыферэнцыяцыя вышэйшага саслоўя і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства. | **4** | | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,2,3,4, 5,6,7] | Канспект лекцый |
| 6 | **Тэма. Саслоўе сельскіх абывацелей у 1861–1917 гг.**<br>1. Аграрная рэформа 1861 г. Ліквідацыя прыгону. Асабістая незалежнасць сялян.<br>2. Надзяленне зямлёй. Выкупная аперацыя.<br>3. Рэформа ўдзельнай і дзяржаўнай вёскі.<br>4. Органы сялянскага саслоўнага самакіравання.<br>5. Сталыпінская аграрная рэформа.<br>6. Ліквідацыя абшчыннага і ўсталяванне асабістага прыватнага землеўладання сялян.<br>7. Стварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак.<br>8. Перасяленне сялян. Аказанне агратэхнічнай дапамогі.<br>9. Сялянская сельскагаспадарчая вытворчасць. Земляробства. Пераход ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы ў земляробстве.<br>10. Жывёлагадоўля. | | **2** | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі”<br><br>Атлас гісторыі Беларусі | [1,2,3,4, 5,6,7] | Даклады |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 11. Сялянскія промыслы і прадпрымальніцтва.<br>12. Эканамічная і сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства.<br>13. Трансфармацыя функцый органаў сялянскага самакіравання ў эпоху сталыпінскіх рэформ.<br>14. Пераўтварэнне селяніна з паў-персоны ў грамадзяніна | | | | | |
| **Усяго** | | **8** | **6** | | | **залік** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура


**Асноўная:**

1. Гісторыя Беларусі : вучэбна-метадычны комплекс [Электронны рэсурс] / склад. А. Ф. Вялікі, Л. Э. Дзічкоўская, З. І. Канапацкая, А. В. Касовіч, М. М. Сакалоў. – Мінск: БДПУ, 2019. – 530 с. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/249. – Дата доступу: 06.05.2021.
2. Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : вучэб.-метад. дапам. / А. П. Жытко [і інш.] ; пад агул. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2017. – 380 с.
3. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие / С. А. Елизаров [и др.]. – 2 изд., испр. – Минск : Высш. шк., 2016. – 398 с.
4. История Беларуси в контексте мировых цивилизаций : учеб. пособие / В. И. Голубович [и др.] ; под ред. Н. И. Полетаевой, А. М. Сасим. – Минск : Экоперспектива, 2017. – 147 с.
5. Кахановскі, А.Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.: вучэб.-метад. дапам./ А.Г.Кахановскі. – Мінск: БДУ, 2017. – 251с.
6. Эвалюцыя вышэйшага саслоўя Беларусі (XIX - пачатак XX ст.) : вучэбна-метадычны комплекс [Электронны рэсурс] / склад. А.П.Жытко. – Мінск: БДПУ, 2019 . – Рэжым доступу http://elib.bspu.by/handle/doc/7705. - Дата доступу: 27.05.2021.
7. Экономическая модернизация в Беларуси: учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / сост. А.П.Житко. – Минск: БГПУ, 2020 . – Режим доступа http://elib.bspu.by/handle/doc/48746. – Дата доступа: 27.05.2021.

**Дадатковая**

1. Беккер, С. Миф о русском дворянстве: Дворянство и привелегии последнего периода императорской России / С. Беккер; пер. с англ.Б.Пинскера. – М.: Новое литературное обозрение, 2012. – 346 с.
2. Бохан, Ю. М. Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. / Ю. М. Бохан. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 450 с., [8 с.] іл.
3. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – 2 т.
4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – 2008. – 688 с.

5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / [рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]; рэдактары тома: В. Яноўская, С. Рудовіч, 2005. – 518, [1] с.
6. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму : вучэбны дапаможнік : у 5 ч. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі " Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка". – Мінск : БДПУ, 2005—2011.– Ч. 1: Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі / склад. А.П. Жытко [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2005. – 138 с.
7. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Другая палова XIII - першая палова XVII стст. / П. Ф. Дзмітрачкоў. – Вуч. дап. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – 312 с.
8. Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А.П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003.
9. Ермаловіч, М. І. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае / М. І. Ермаловіч. – Навуковае выданне. – Мінск : Беллітфонд, 2003. – 448 с.
10. История белорусской государственности : монография : в 5 т. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. – 2018. – 598 с.
11. Каханоўскі, А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А.Г. Каханоўскі ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.
12. Корелин, А.П. Дворянство в пореформенной России 1861–1904 гг. : Состав, численность, корпоративная организация. – М. : Наука, 1979. – 304 с.
13. Новик, Е. К. История Беларуси: с древнейших времен до 2013 г. : учеб. пособие для студентов высш. образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред. Е. К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : Выш. шк., 2013. – 558 с.
14. Першин, С.В., Сословия в России в конце XVIII - середине XIX века : учебное пособие / С.В. Першин. – Саранск : ФГБОУ ВПО "МордГПИ", 2014. – 320 с.

**Прыкладны спіс пытанняў да заліку па вучэбнай дысцыпліне «Эвалюцыя саслоўяў Беларусі»**

1. Распад родавай і стварэнне сельскай абшчыны (верві).
2. Сацыяльныя групы сялянства і іх трансфармацыя: людзі, смерды, закупы, радовічы, прошчаннікі ў VI – першай палове XIII ст.
3. Велікакняжацкая ўлада.
4. Фарміраванне саслоўя феадалаў на беларускіх землях.
5. Вялікі князь і яго ўлада. Князі – нашчадкі Рурыкавічаў і Гедымінавічаў у ВКЛ.
6. Вышэйшая чыноўная знаць – паны і свецкія феадалы – шляхта і зямяне.
7. Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць вышэйшага саслоўя ВКЛ.
8. Маёмасная іерархія свецкіх феадалаў ВКЛ.
9. Шляхецкае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай.
10. Сяляне-даннікі і сяляне-дольнікі. Пераўтварэнне даннікаў у цяглых людзей. Паншчына. Перавод на грашовую рэнту асадных людзей і чыншавікоў. Адработная рэнта.
11. Аграрная рэформа 1557 г. Валочная памера. Рэгламентаванне грашовай рэнты і паншчыны.
12. Запрыгоньванне сялянства. Тыпы сялян: «людзі пахожыя», альбо «вольныя»; «людзі непахожыя», альбо «вотчычы»; «чэлядзь нявольная» (рабы); «закупы». Прывілей 1447 г.
13. Абасабленне рамяства ад земляробства і ўзнікненне гарадскіх паселішчаў. Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі.
14. Насельніцтва гарадоў. Свецкія і духоўныя феадалы, прыслуга, рамеснікі, купцы. Купецкія і рамесныя цэхі.
15. Магдэбургскае права. Гарадское самакіраванне і асаблівасці яго рэалізацыі ў гарадах Беларусі.
16. Спадчыннае і асабовае дваранства. 3.Даравальная грамата дваранству1785 г.
17. Структура і функцыі араганаў дваранскага самакіравання.
18. Памеснае дваранства. Насаджэнне рускага землеўладання. Зямельныя канфіскацыі.
19. Палітыка «разбору шляхты».
20. Інвентарная рэформа.
21. Сацыяльныя групы саслоўя сельскіх абывацелей. Дзяржаўныя, удзельныя і памешчыцкія сяляне і іншыя сацыяльныя групы 1772–1861 гг.
22. Сялянская гаспадарка 1772–1861 гг.
23. Павіннасці панскіх сялян па выніках інвентарнай рэформы.
24. Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўных маёнтках.
25. «Жалованная грамота на права и выгоды городам Российской империи» 1785 г. Увядзенне саслоўнага гарадскога самакіравання.
26. Асноўныя сацыяльныя групы насельніцтва гарадоў у 1772–1875 гг.
27. Трансфармацыя саслоўнага гарадскога самакіравання ў бессаслоўнае ў 1875 г. Фактычная ліквідацыя саслоўя гарадскіх абывацелей.

28. Дынаміка колькаснага, канфесійнага і нацыянальнага складу дваранства края ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

29. Ліквідацыя выбарных органаў дваранскай карпарацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

30. Трансфармацыя інстытута прадвадзіцелей дваранства.

31. Праблема аднаўлення дваранскіх выбараў у Беларусі.

32. Дзяржаўная служба вышэйшага саслоўя ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

33. Гаспадарча-эканамічная дзейнасць памеснага дваранства ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

34. Сацыяльная дыферэнцыяцыя вышэйшага саслоўя і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

35. Аграрная рэформа 1861 г. Ліквідацыя прыгону. Асабістая незалежнасць сялян.

36. Рэформа ўдзельнай і дзяржаўнай вёскі.

37. Органы сялянскага саслоўнага самакіравання ў 1861–1917 гг.

38. Сталыпінская аграрная рэформа ў 1861–1917 гг.

39. Ліквідацыя абшчыннага і ўсталяванне асабістага прыватнага землеўладання сялян.

40. Сялянская сельскагаспадарчая вытворчасць. Земляробства. Пераход ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы ў земляробстве.

41. Эканамічная і сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства ў 1861–1917 гг.

42. Трансфармацыя функцый органаў сялянскага самакіравання ў эпоху сталыпінскіх рэформ.

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Эвалюцыя саслоўяў Беларусі »**

Мэтай метадычных рэкамендацый з’яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку за кошт самастойнай работы, падчас якой студэнт становіцца актыўным суб’ектам навучання, што азначае:

— здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;

— падрыхтаванасць да мабілізацыі інтэлектуальных і валявых намаганняў для дасягнення вучэбных мэт;

— уменні праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць, а таксама ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на падставе ўнутранай станоўчай матывацыі;

— усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцей і псіхалагічную падрыхтаванасць да складання праграмы дзейнасці па самаразвіцці.

**Віды самастойнай работы студэнтаў**

| | |
|---|---|
| *Рэпрадуктыўная самастойная работа* | Самастойнае чытанне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, запамінанне, пераказ, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу і г. д. |
| *Пазнавальна-пошукавая самастойная работа* | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор адпаведнай літаратуры, напісанне рэфератаў, курсавых, дыпломных работ і г. д. |
| *Творчая самастойная работа* | Удзел у навукова-даследчай рабоце, навуковых мерапрыемствах, выкананне творчых праектаў па індывідуальных і групавых заданнях і г. д. |

**Арганізацыя і кантроль самастойнай работы**

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыях і семінарскіх занятках. Для гэтага выкладчык загадзя распрацоўвае і рэалізуе сістэму самастойнай работы, улічваючы ўсе яе формы, мэты, ажыццяўляе адбор неабходнай інфармацыі і сродкаў (метадчных) камунікацый, вызначае ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім. Пытанні для самастойнай работы студэнтаў, якія прыведзены ў рабочай праграме дысцыпліны, прапаноўваюцца выкладчыкамі напачатку вывучэння дысцыпліны. Студэнты маюць права дадаткова выбіраць тэмы, якія іх цікавяць, для самастойнай работы.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | - тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>- дае разгорнуты ці кароткі інструктаж пра патрабаванні, якія прад'яўляюцца да СР і спосабах яе выканання;<br>- дэманструе ўзор СР | - асэнсоўвае і прымае мэту СР як асабіста значную;<br>- знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | - раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбнасць і падрыхтаванасць да выканання СР;<br>- надае студэнту матывацыю для дасягнення поспеху | - фарміруе ўласную пазнавальную патрэбнасць у выкананні СР;<br>- фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | - ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>- дае агульныя арыенціры выканання СР | - ажыццяўляе планаванне і праектаванне СР, а таксама рацыянальнае размеркаванне часу, неабходнага для яе выканання |
| Кантроль і карэкцыя выканання СР | - ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню падрыхтаванасці студэнта да выканання СР;<br>- ажыццяўляе кантроль канчатковых вынікаў выканання СР | - ажыццяўляе бягучы самакантроль за ходам выканання СР;<br>- выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі і ўносіць карэктывы ў работу;<br>- праводзіць пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>- ажыццяўляе рэфлексію ўласнай дзейнасці;<br>- ажыццяўляе самакантроль вынікаў СР |
| Ацэнка | - на падставе параўнання вынікаў з эталонам, загадзя зададзенымі крытэрыямі дае ацэнку СР;<br>- выяўляе тыповыя памылкі, | - на падставе параўнання вынікаў з мэтай дае самаацэнку сваім пазнавальным магчымасцям, |

| | | |
|---|---|---|
| | акцэнтуе ўвагу на станоўчых і адмоўных баках, дае метадычныя парады па выкананні СР, вызначае далейшыя кірункі выканання СР;<br>- устанаўлівае ўзровень і вызначае якасць самастойнай дзейнасці студэнта, на падставе чаго фарміруе ў апошняга матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | здольнасцям і якасцям |

*Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў* (далей – самастойная работа) – вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка. Яна прадугледжвае:

– падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў і выкананне адпаведных заданняў;

– самастойную работу па вывучэнні тэм вучэбных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі;

– напісанне дакладаў, эсэ;

– выкананне кантрольных і курсавых работ;

– падрыхтоўку да кантрольных выпрабаванняў, у тым ліку да комлексных экзаменаў і залікаў;

– удзел у навуковых мерапрыемствах (выставы, канферэнцыі, сімпозіумы, семінары і г. д.).

Выкананне студэнтамі любога віда самастойнай работы прадугледжвае наступныя этапы:

– пастаноўка мэты самастойнай работы;

– канкрэтызацыя пазнавальнай задачы;

– самаацэнка падрыхтаванасці да самастойнай работы па вырашэнні пастаўленай задачы;

– выбар адпаведных сродкаў вырашэння пастаўленай задачы;

– планаванне самастойнай работы па вырашэнні задач самастойна альбо пры дапамозе выкладчыка;

– рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

## Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Сельскае насельніцтва ў VI – першай палове XIII ст.** | **4** | Разлажэнне родаплемянных адносін. Пераход да ворыўнага земляробства.Распад родавай і стварэнне сельскай абшчыны (верві). Вялікасямейная (VI–VII стст.), суседска-вялікасямейная (VIII–IX стст.), суседская (X–XI стст.) абшчыны. Пераход ад родавай да сямейнай і індывідуальнай уласнасці. Сацыяльныя групы сялянства і іх трансфармацыя: людзі, смерды, закупы, радовічы, прошчаннікі, ізгоі, халопы. | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 2 | **Фарміраванне вышэйшага саслоўя.** | **4** | Велікакняжацкая ўлада. Старэйшыя і малодшыя дружыннікі. Васалітэт. Васал-дружыннік, мужы, баяры.Складванне спадчыннай уласнасці – вотчыны. Княжацкія і баярскія вотчыны. Фарміраванне саслоўя феадалаў. | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 3 | **Вышэйшае саслоўе ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.** | **4** | Вялікі князь і яго ўлада. Князі – нашчадкі Рурыкавічаў і Гедымінавічаў. Вышэйшая чыноўная знаць – паны. Свецкія феадалы – шляхта і зямяне. Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць вышэйшага саслоўя. Маёмасная іерархія свецкіх феадалаў. Шляхецкае самакіраванне ў Рэчы Паспалітай. | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 4 | **Сацыяльная трансфармацыя сельскага насельніцтва.** | **4** | Сялянскае спадчыннае землекарыстанне – вотчына. Натуральны характар сельскай гаспадаркі. Сяляне-даннікі і сяляне-дольнікі. Пераўтварэнне даннікаў у цяглых людзей.Паншчына. Перавод на грашовую рэнту асадных людзей і чыншавікоў. Адработная рэнта. Аграрная рэформа 1557 г. Валочная памера. | Падрыхтоўка прэзентацый |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Рэгламентаванне грашовай рэнты і паншчыны. Запрыгоньванне сялянства. Асабіста вольныя сяляне. Асабіста залежныя сяляне: «людзі пахожыя», альбо «вольныя»; «людзі непахожыя», альбо «вотчычы»; «чэлядзь нявольная» (рабы); «закупы». Юрыдычнае афармленне прыгоннага права ў ВКЛ – Прывілей 1447 г. Замацаванне прыгону ў Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. | |
| 5 | **Саслоўны склад гарадскога насельніцтва ў IX–XVIII стст.** | **4** | Абасабленне рамяства ад земляробства і ўзнікненне гарадскіх паселішчаў. Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі – Полацк, Тураў, Віцебск, Заслаўе, Друцк, Бярэсце і інш. Гарады як гандлёва-рамесныя, адміністрацыйна-фіскальныя, ваенна-абарончыя, культурныя і рэлігійныя цэнтры. Насельніцтва гарадоў. Свецкія і духоўныя феадалы, прыслуга, рамеснікі, купцы. Купецкія і рамесныя цэхі. Магдэбургскае права. Гарадское самакіраванне і асаблівасці яго рэалізацыі ў гарадах Беларусі. | Падрыхтоўка дакладаў |
| 6 | **Вышэйшае саслоўе Беларусі ў 1772–1861 гг.** | **4** | Распаўсюджанне прывілеяў расійскага дваранства на шляхту былой Рэчы Паспалітай. Спадчыннае і асабовае дваранства. Даравальная грамата дваранству1785 г. .Структура і функцыі ораганаў дваранскага самакіравання. Паместнае дваранства. Насаджэнне рускага землеўладання. Зямельныя канфіскацыі. Палітыка «разбору шляхты». Памешчыцкая сельскагаспадарчая і прамысловая вытворчасць.Інвентарная рэформа | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 7 | **Саслоўе сельскіх абывацелей у 1772–1861 гг.** | **4** | Сацыяльныя групы саслоўя сельскіх абывацелей. Дзяржаўныя, удзельныя і памешчыцкія сяляне. Вольныя людзі, аднадворцы, праваслаўныя арандатары, каланісты, адзінаверцы, чыншавікі і інш. Сялянская гаспадарка. Павіннасці панскіх | Справаздача па індывідуальных заданнях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | сялян па выніках інвентарнай рэформы. Дзяржаўныя падаткі і павіннасці сялянства. Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўных маёнтках. Органы самакіравання дзяржаўных сялян. | |
| 8 | **Тэма 9. Саслоўе гарадскіх абывацелей у 1772–1875 гг.** | **4** | Дынаміка колькасці гарадскога насельніцтва. Адміністрацыйныя і грамадскія функцыі гарадоў.«Жалованная грамота на права и выгоды городам Российской империи» 1785 г. Увядзенне саслоўнага гарадскога самакіравання.Асноўныя сацыяльныя групы насельніцтва гарадоў. Падаткі і павіннасці гараджан. Эканоміка беларускіх гарадоў. Трансфармацыя саслоўнага гарадскога самакіравання ў бессаслоўнае ў 1875 г. Фактычная ліквідацыя саслоўя | Падрыхтоўка дакладаў |
| 9 | **Тэма 10. Вышэйшае саслоўе Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.** | **6** | Дынаміка колькаснага, канфесійнага і нацыянальнага складу дваранства края. Тэрытарыяльная мабільнасць і ўзровень адукацыі саслоўя. Ліквідацыя выбарных органаў дваранскай карпарацыі. Трансфармацыя інстытута прадвадзіцелей дваранства.Праблема аднаўлення дваранскіх выбараў. Дзяржаўная служба вышэйшага саслоўя. Гаспадарча-эканамічная дзейнасць памеснага дваранства. Дваранскае змелеўладанне і земляробства. Пераход ад баршчыннай да капіталістычнай сістэмы ў земляробстве. Дваранская жывёлагадоўля.Прамысловае прадпрымальніцтва. Сацыяльная дыферэнцыяцыя вышэйшага саслоўя і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства. | Падрыхтоўка прэзентацый |
| 10 | **Саслоўе сельскіх абывацелей у 1861–1917 гг.** | **8** | Аграрная рэформа 1861 г. Ліквідацыя прыгону. Асабістая незалежнасць сялян. Надзяленне зямлёй. Выкупная аперацыя. Рэформа ўдзельнай і дзяржаўнай вёскі. Органы сялянскага саслоўнага | Справаздача па індывідуальных заданнях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | самакіравання. Сталыпінская аграрная рэформа. Ліквідацыя абшчыннага і ўсталяванне асабістага прыватнага землеўладання сялян. Стварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак. .Перасяленне сялян. Аказанне агратэхнічнай дапамогі.Сялянская сельскагаспадарчая вытворчасць. Земляробства. Пераход ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы ў земляробстве. Жывёлагадоўля. Сялянскія промыслы і прадпрымальніцтва. Эканамічная і сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства. Трансфармацыя функцый органаў сялянскага самакіравання ў эпоху сталыпінскіх рэформ. селяніна з паў-персоны ў грамадзяніна | |
| | **Усяго** | **46** | | |

## Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнта

**Тэма « Вышэйшае саслоўе Беларусі ў 1772–1861 гг. » (2 гадзіны - семінар)**

**Першы модуль**

Складаць канспект па тэме «Вышэйшае саслоўе Беларусі ў 1772–1861 гг.»

**Другі модуль**

Падрыхтаваць даклады па тэме «Даравальная грамата дваранству 1785 г. Структура і функцыі органаў дваранскага самакіравання».

**Трэці модуль**

Падрыхтаваць творчыя праекты па групавых заданнях на тэму «Палітыка «разбору» шляхты».

**Тэма: Саслоўе сельскіх абывацелей у 1772–1861 гг.(2 гадзіны - семінар)**

**Першы модуль**

Складаць канспект па тэме «Саслоўе сельскіх абывацелей у 1772–1861 гг. » на падставе зместу манаграфічных выданняў з рэкамендаванага спіса дадатковай літаратуры.

**Другі модуль**

Падрыхтаваць даклады па тэме «Павіннасці панскіх сялян па выніках інвентарнай рэформы».

**Трэці модуль**

Падрыхтаваць творчыя праекты па групавых заданнях на тэму «Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўных маёнтках».

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш ўтрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне вызначанага Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі аб'ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – уменння ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г. д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя заключана ва урыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу – прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з'явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага, неабходнага і вызначальнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – выкарыстоўваючы матэрыял вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не на шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні.

7. Адлюстраваць схематычна – раскрыць змест адказу лаканічна, абагульнена, пры неабходнасці ў выглядзе розных графічных формаў (схема, табліца, малюнак і г. д.).

Важную ролю ў ажыццяўленні самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі адыгрывае праца з літаратурай да ўсіх відаў заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціраванняў, удзелу ў навуковых мерапрыемствах.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення зместу спецыяльнай навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Формы запісаў могуць быць разнастайнымі: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект.

Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой выгляд інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі выконваць задачы правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

## Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў

Напісанне пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

— навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

— прывіццё навыкаў рэферыравання навуковых артыкулаў па праблематыцы вывучаемых дысцыплін;

— выпрацоўка ўмення падрыхтоўкі паведамленняў, дакладаў і выступленняў;

— набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

— сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

— далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;

— навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і абгрунтаваных.

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:
1. Вусная форма:
– гутарка;
– даклады на семінарах;

2. Пісьмовая форма:
– тэсты;
– пісьмовыя кантрольныя работы;
– пісьмовы залік

## Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнта

**<u>Не залічана</u>**

Адсутнасць адказу або адмова ад адказу. Распазнанне аб’екта вывучэння, асобных тэрмінаў і фактаў, праявы імкнення пераадолець вучэбныя цяжкасці, праяўленне інтарэсу да вывучэння прадмета, адлічча вызначэнняў, стуктурных элементаў ведаў, праявы валявых намаганняў і матывацыя вучэння.

**<u>Залічана</u>**

Няпоўнае знанне праграмнага матэрыялу на узроўні памяці, наяўнасць значных, але выпраўленых з дапамогай выкладчыка памылак, цяжкасці ў прымяненні спецыяльных і інтэлектуальных уменняў, імкненне да пераадолення цяжкасцей, праяўленне адказнасці, самакрытычнасці. Асваенне вучэбнага матэрыялу на рэпрадукцыйным узроўні і няпоўнае яго ўзнаўленне, наяўнасць памылак, якія можна выправіць пры дадатковых пытаннях. Усвядомленае ўзнаўленне праграмнага матэрыялу, у тым ліку рознай ступені складанасці, з некаторымі памылкамі. Поўнае ўзнаўленне праграмнага матэрыялу, у тым ліку прымяненне ведаў, спецыяльных, агульнавучэбных і інтэлектуальных уменняў з дапамогай выкладчыка. Праявы настойлівасці і імкненне пераадолеваць цяжкасці. Авалоданне праграмным матэрыялам, у тым ліку рознай ступені цяжкасці, праявы добрасумленнасці, адказнасці, самаацэнкі і г. д. Свабоднае валоданне праграмным матэрыялам рознай ступені цяжкасці ў незнаёмай сітуацыі, выкананне заданняў творчага характару. Высокі ўзровень самастойнасці і эрудыцыі.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Беларусі | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 28.03.2017 г.) |
| Эвалюцыя вышэйшага саслоўя Беларусі (XIX – пачатак XX ст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 28.03.2017 г.) |